# «Год вельмі добры» — Лукашэнка ацаніў работу АПК

Фота з архіва

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пазітыўна ацаніў работу сельскагаспадарчай галіны ў 2020 годзе. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў сёння, адказваючы на пытанні журналістаў у час рабочай паездкі ў Слуцкі раён, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Прэзідэнт адзначыў, што бягучы год, вядома, няпросты, але ў частцы вынікаў работы аграпрамысловага комплексу ён быў удачны. «Год вельмі добры, нягледзячы на тое, што ён высакосны, кавідны, палітычны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У Беларусі сабраны багаты ўраджай збожжа — больш як 10,3 млн т, уключаючы 8,5 млн т збожжавых каласавых, кукурузу, рапс.

Прэзідэнт яшчэ раз адзначыў правільнасць выбранага ў Беларусі шляху па процідзеянні каранавіруснай інфекцыі, дзякуючы якому ў краіне не спынялася эканамічная дзейнасць, працавалі прадпрыемствы АПК, забяспечана харчовая бяспека. «І тое, што мы не прагнуліся пад кавід вясной — цяпер ужо і вы бачыце, што мы правільна зрабілі. І цяпер аграрыі кажуць, што толькі 10-15 працэнтаў на складах запас (гатовай прадукцыі. — Заўвага БЕЛТА). Усё са свістам ідзе на экспарт, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Будзем апрануты, накормлены і прададзім мільярдаў на 5-6 (долараў. — Заўвага БЕЛТА) сельгаспрадукцыі».

БЕЛТА